# ПОЛЕ НЕЗАЛЕЖНАЕ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ 2024: АКТАРЫ, ВЫКЛІКІ, БУДУЧЫНЯ

## ВЫНІКІ БАЗАВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

Funded by
the European Union

DANSK KULTUR-INSTITUT
DANISH CULTURAL INSTITUTE

БЕЛАРУСКАЯ
РАДА
КУЛЬТУРЫ

| | |
|---|---|
| УВОДЗІНЫ | 3 |
| ПОЛЕ НЕЗАЛЕЖНАЕ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ: АСНОЎНЫЯ РЫСЫ | 5 |
| АКТАРЫ НЕЗАЛЕЖНАЕ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ: СТРУКТУРА І КЛАСІФІКАЦЫІ | 7 |
| СУВЯЗІ І ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ КУЛЬТУРНІЦКІХ АКТАРАЎ. СЕТКІ, АСАЦЫЯЦЫІ І КААЛІЦЫІ | 10 |
| ТРЭНДЫ І ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ НЕЗАЛЕЖНАЕ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ (2023–2024) | 15 |
| АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ І ВЫКЛІКІ | 18 |
| АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ ДАСЛЕДАВАННЯ: НОВЫ СТАТУС-КВО, ДВА ТРЭКІ РАЗВІЦЦЯ КУЛЬТУРНІЦКАЙ ЭМІГРАЦЫІ І КАНЕЦ ІЛЮЗІЯЎ | 22 |
| КІРУНКІ РАЗВІЦЦЯ: РЭКАМЕНДАЦЫІ І МАГЧЫМЫЯ НАСТУПНЫЯ КРОКІ | 24 |

# УВОДЗІНЫ

Перад вамі – даследчая работа. Навуковы тэкст, у цэнтры ўвагі якога – асноўныя арганізацыі, дзеячы беларускае культуры ў краіне ды за мяжой і тыя ўмовы, у якіх яны існавалі (былі вымушаныя існаваць) у канцы 2024 года.

Замовілі працу Беларуская Рада культуры і Дацкі інстытут культуры, а штуршком для вывучэння фонавых умоваў існавання нашае культуры сёння сталася завяршэнне першай эдыцыі вялікае праграмы ArtPower Belarus. Даследаванне, праведзенае з той жа мэтаю пасля старту ArtPower Belarus, знойдзеце тут.

## Мэты работы

**Апісанне поля арганізацыяў ды ініцыятываў, чыя дзейнасць скіраваная на развіццё і прасоўванне беларускае культуры, аналіз праблемаў і перспектываў развіцця супольнасці, а таксама ацэнка зменаў і дынамікі ў беларускім культурным полі за апошні год, пачынаючы з другой паловы 2023-га (калі праводзілася мінулае даследаванне).**

Такая ацэнка неабходная найперш суб’ектам, якія прэтэндуюць на развязанне заданняў у галіне развіцця сферы беларускае культуры, у тым ліку для выпрацоўвання стратэгіяў, праграмаў і канкрэтных праектаў для развіцця культурнага поля, адэкватных патрэбам дзеячаў культуры. Акрамя таго, такая аналітыка карысная культурнцікім актарам, асабліва тым, хто імкнецца сваёй дзейнасцю развіваць, фасілітаваць і лабіяваць інтарэсы беларускае культуры. Разуменне адэкватнае карціны стану беларускае незалежнае культуры можа спрыяць больш карэктнаму выбару прыярытэтаў, стратэгіяў і тактык у яе развіцці, дыялогу і партнёрстве.

Мы таксама мяркуем, што пашырэнне ведаў пра беларускую культуру, павелічэнне колькасці даследаванняў і ўсебаковая аналітыка гэтага комплекснага аб’екту будзе спрыяць выпрацоўванню ды ўзгадненню агульных стратэгічных пазіцыяў паміж рознымі актарамі беларускае грамадзянскае супольнасці для пераадолення

крызісных з'яваў і выхаду на пазітыўны трэк развіцця супрацы ў галіне.

## Эмпірычная база

- Вынікі маніторынгу адкрытых крыніцаў.
- Вынікі онлайн-анкетавання (50 анкетаў).
- Вынікі экспертнага апытання (16 інтэрв'ю).

Тэрміны правядзення даследавання: восень 2024 года.

**Увага! З прычынаў бяспекі мы публікуем скарочаную версію фінальнага тэксту. Назвы некаторых культурніцкіх арганізацыяў ды ініцыятываў, актыўных у полі, схаваныя па ўзгадненні з іх прадстаўнікамі.**

# ПОЛЕ НЕЗАЛЕЖНАЕ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ: АСНОЎНЫЯ РЫСЫ

Летась, падчас уступнага baseline-даследавання, у адкрытых крыніцах нам удалося знайсці звесткі пра 1**70 незалежных арганізацыяў ды ініцыятываў**, што дзеюць у рэчышчы беларускае культуры. Сёлета адшукалася інфармацыя агулам пра **266**[1] **арганізацыяў**. Гэтая колькасць далёкая ад 100 % ахопу ўсіх ініцыятываў і арганізацыяў, так ці інакш звязаных з беларускай культурай. У поле нашай увагі трапілі актары розных арганізацыйных формаў і тыпаў: грамадскія арганізацыі, камерцыйныя і некамерцыйныя ўстановы, творчыя калектывы і нефармальныя ініцыятывы, фонды і асацыяцыі.

Не маючы магчымасці дакладна ацаніць колькасны аб'ём і дынаміку культурніцкага сектару, тым не менш мы можам сфармуляваць колькі тэндэнцыяў.

1. **Паступовае змяншэнне колькасці юрыдычных ліквідацыяў грамадскіх арганізацыяў**, што мелі дачыненне да культурніцкае дзейнасці ў Беларусі. З другое паловы 2021 году ўлады краіны пачалі сістэматычна пазбаўляць афіцыйнае рэгістрацыі арганізацыі грамадзянскае супольнасці. Паводле праваабаронцаў, да сярэдзіны 2023-га **каля 220 арганізацыяў** былі зліквідаваныя такім чынам; за апошні ж год гэты паказнік павялічыўся яшчэ на 19 арганізацыяў. Мы атрымалі зачышчанае поле і сітуацыю, блізкую да вычарпанасці гэтага метаду інстытуцыйнага ціску. Гэтыя ж абставіны ў будучыні могуць паспрыяць паступоваму насычэнню легальнага культурнага поля ў краіне новымі дзеячамі. Сярод новых ініцыятываў і арганізацыяў, што трапілі сёлета ў нашую базу, нямала актараў, якія дзеюць у Беларусі. Аднак, як правіла, гэта ўжо не грамадскія ўстановы, а камерцыйныя і паўкамерцыйныя ці цалкам валанцёрскія онлайн-праекты (блогі, падкасты, мікрамедыі і г. д.). Таксама ёсць выпадкі рэгістрацыі новых незалежных культурніцкіх установаў.

2. **З'яўленне новых культурніцкіх установаў ды ініцыятываў за межамі Беларусі.** Культурнае поле ў розных краінах не перастае папаўняцца новымі беларускімі ўдзельнікамі. Тут важна зазначыць у цэлым станоўчую дынаміку ў фармальна-колькасным вымярэнні: ініцыятываў, што афіцыйна спынілі існаванне, значна менш, чымся

[1] З гэтае колькасці як мінімум 21 арганізацыя з'явілася ў 2023–2024 гадах.

тых, што з’явіліся цягам апошняга году. Аднак шмат якія ініцыятывы на паўзе, амаль не вядуць дзейнасці альбо зрэдку рэалізуюць культурніцкую актыўнасць.

Часта з’яўленне новых ініцыятываў у эміграцыі – не сведчанне з’яўлення новых суб’ектаў, а, хутчэй, перазбор (як правіла, эпізадычны) прадстаўнікоў існых ініцыятываў вакол больш перспектыўных формаў арганізацыяў, прытым што іх асноўныя структуры – у крызісным стане. Прыкладам можа быць сфера беларускага тэатру за мяжой, якая папоўнілася новымі праектамі ды ініцыятывамі, нягледзячы на тое, што шмат якія тэатральныя калектывы, якія з’явіліся раней, намінальна існуюць, але не маюць магчымасцяў актыўна дзеяць.

Узнікаюць новыя арганізацыі, фонды, грамадскія аб’яднанні, кавярні і бары з культурніцкім складнікам, камерцыйныя і паўкамерцыйныя культурніцкія прапановы. Асабліва гэта відаць у Беларусі, дзе эксперты адзначаюць заўважны пад’ём культурніцкае вытворчасці. Але асноўныя ўстаноўкі дзяржаўнае палітыкі адносна незалежнага культурнага поля засталіся нязменныя, таму гэты ўздым (кветак, што прарастаюць праз асфальт) няўстойлівы. Акрамя таго, стан усёй незалежнай сферы культуры ў краіне настолькі пагоршыўся з 2020-га, што ацэнка гэтага ўздыму апошняга году – паўтара можа быць звязаная, хутчэй, з эфектам нізкае базы.

Аналізуючы характар гэтае з’явы, можна сказаць, што ў краіне назіраецца рост і развіццё медыяпраектаў, падкастаў і г. д. аж да выпуску адзення і мерчу, звязанага з традыцыйнаю культураю, спадчынай і беларускаю моваю. Таксама даволі дынамічна ў Беларусі развіваецца сфера музыкі: за апошні год з’явілася мноства новых моладзевых гуртоў розных жанраў, многія з якіх выбралі для сябе творчасць на беларускай мове, а сучасныя тэхналогіі ды сацыяльныя медыі дапамагаюць ім без асаблівых выдаткаў знаходзіць свайго слухача.

У эміграцыі агульная сітуацыя часта вызначаецца экспертамі як стагнацыя: колькасць масавых культурніцкіх імпрэзаў і вытворчасць культурніцкага прадукту ў параўнанні з 2020–2021 гадамі знізілася, а цікавасць беларускіх дыяспараў да культурніцкіх івэнтаў таксама зрабілася ўмеранаю. Найгорш сітуацыя адчуваецца ў сферах кіно і тэатру, найлепш – у кнігавыдавецкай справе. Але факт захавання статусу-кво беларускае культурніцкае сферы ў эміграцыі нельга не адзначыць як станоўчы.

## АКТАРЫ НЕЗАЛЕЖНАЕ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ: СТРУКТУРА І КЛАСІФІКАЦЫІ

Падчас даследавання мы мелі справу з наступнымі **тыпамі суб’ектаў/актараў:**

- арганізацыі грамадзянскае супольнасці, што працуюць з беларускай культурай у Беларусі і за яе межамі, любых устойлівых формаў (грамадскія аб’яднанні, установы, асацыяцыі ды інш.), зарэгістраваныя або якія з пэўных прычынаў не маюць рэгістрацыі;

- нефармальныя (не маюць інстытуцыйнага афармлення) ініцыятывы ў сферы культуры;

- незалежныя творчыя калектывы (тэатральныя, музычныя ды інш.);

- камерцыйныя і некамерцыйныя структуры ды пляцоўкі, што забяспечваюць інфраструктурныя кампаненты культурніцкага працэсу (выдавецтвы, выставачныя цэнтры, фестывалі, школы або іншыя адукацыйныя пляцоўкі, даследчыя і медыйныя структуры);

- індывідуальныя ўдзельнікі культурніцкага працэсу – пісьменнікі, мастакі, музыкі, дызайнеры, фатографы, акторы, перакладнікі, журналісты, педагогі, даследнікі, менеджары, прадзюсары ды інш.

Нашая даследчая ўвага была скіраваная найперш на рознага кшталту культурніцкія арганізаванасці, то бок на першыя 4 тыпы суб’ектаў, прэзентаваныя ў класіфікацыі вышэй.

Сярод актараў такіх тыпаў можна вылучыць некалькі асноўных кластараў:

- лакальныя ініцыятывы беларускіх дыяспараў (маюць культурніцкі кампанент у дзейнасці, ладзяць канцэрты, вечарыны, майстар-класы, традыцыйныя святы);

- грамадскія арганізацыі ці ініцыятывы, што маюць культурніцкі контур у якасці аднаго з кірункаў дзейнасці;

- арганізацыі, для якіх культурніцкая дзейнасць асноўная.

У мэтах даследавання сярод беларускіх арганізацыяў ды ініцыятываў,

для якіх культурніцкі кірунак дзейнасці базавы (трэці кластар), мы вылучаем **два блокі культурніцкіх суб’ектаў/актараў:**

1. тэматычная культурніцкая дзейнасць,
2. развіццё культурнага поля.

**Першы блок** рэпрэзентаваны суб’ектамі, асноўная дзейнасць якіх скіраваная на наданне **культурніцкіх паслуг** або вытворчасць **культурніцкага прадукту** (выданне кніг, вытворчасць культурніцкага онлайн-кантэнту і г. д.) ці выкананне канкрэтнага **тыпу дзеяння** (ахова помнікаў гісторыі і культурных ландшафтаў і г.д.).

Усе арганізацыі, чыя асноўная дзейнасць скіраваная на развіццё і стварэнне спрыяльных умоваў для культурніцкае дзейнасці, мы аб’ядналі ў **другі блок** – развіццё культурнага поля. Да яго адносяцца як асобныя ініцыятывы, гэтак і сеткавыя ды кааліцыйныя аб’яднанні (партнёрствы арганізацыяў, кансорцыумы, платформы і г. д.). Асобны элемент гэтай групы – хабы і прасторы, што ўяўляюць сабой інфраструктуру для розных ініцыятываў, а таксама онлайн-платформы, што выконваюць аналагічную функцыю.

На сёння можам зафіксаваць наступную канфігурацыю суб’ектаў блоку “Развіццё культурнага поля”:

- **сэрвісныя арганізацыі і фасілітатары** – асобныя інстытуцыі, сеткавыя або кааліцыйныя аб’яднанні арганізацыяў, што імкнуцца паляпшаць інфраструктурныя ўмовы дзейнасці арганізацыяў культурніцкага кіранку, надаваць ім паслугі і дапамогу ў арганізацыйным развіцці, менеджменце, прыцягненні рэсурсаў;

- **тэматычныя (галіновыя) сеткавыя і кааліцыйныя аб’яднанні** (партнёрствы арганізацыяў, кансорцыумы, платформы і да т. п.) – звязы арганізацыяў ды ініцыятываў грамадзянскае супольнасці паводле асобных галінаў ці тэматыцы дзейнасці (тэатр, кіно і г. д.). Іх мэта – узмацніць патэнцыял і пашырыць інстытуцыйныя магчымасці, абмен досведам, экспертнае і адукацыйнае падтрыманне ды прыцягненне рэсурсаў для сяброўскіх арганізацыяў, а таксама кааперацыя намаганняў для рэалізацыі супольных праектаў;

- **фонды і фандрайзінгавыя платформы** рэгулярна збіраюць сродкі на падтрыманне беларускіх дзеячаў культуры ды ініцыятываў;

- **хабы і прасторы** – элементы фізічнай інфраструктуры культурніцкае супольнасці за межамі і (радзей) у Беларусі. Сёння ў Літве, Польшчы, Грузіі, Нямеччыне налічваюцца дзясяткі прастораў, што надаюць плошчы і матэрыяльна-тэхнічную інфраструктуру беларускім ініцыятывам і праектам у сферы культуры, культывуюць вакол сябе супольнасць творцаў, падтрымліваюць і развіваюць нізавыя творчыя ініцыятывы;

- **лічбавая інфраструктура** – інструменты і платформы для рэалізацыі культурніцкіх праектаў ды ініцыятываў, а таксама арганізацыі, што надаюць IT-паслугі на валанцёрскіх пачатках творцам і калектывам.

Пераважная большасць выяўленых намі арганізацыяў мае інстытуцыйны характар, аднак, хутчэй за ўсё, у рэальнасці нефармальных ініцыятываў, так ці інакш звязаных з беларускай культурай, у колькасным вымярэнні больш за тых, што трапілі ў наш даследчы фокус.

**Сярод найбольш відавочных і, на думку шмат каго з экспертаў, прынцыповых лініяў падзелу беларускае сферы культуры застаецца падзел на актараў, што засталіся і працягваюць дзеяць у Беларусі, і тых, хто займаецца беларускаю культураю за межамі роднае краіны.**

Геаграфія арганізацыяў, што дзеюць за межамі Беларусі, даволі шырокая. Самыя буйныя канцэнтрацыі беларускіх культурніцкіх дзеячаў можна знайсці ў Польшчы і Літве[2] (гэтыя краіны – асноўныя рэцыпіенты беларускіх уцекачоў і рэлакантаў). Сярод краінаў далёкага замежжа ў якасці тых, дзе беларуская культурніцкая прысутнасць мае бачны характар, можна вылучыць Чэхію, Нямеччыну, ЗША.

Яшчэ адзін крытэр, паводле якога можна класіфікаваць культурніцкіх актараў, – **аўдыторная арыентаванасць**. Можна вылучыць тры тыпы аўдыторыяў:

- мясцовыя дыяспаральныя супольнасці альбо асобы, якія нядаўна пакінулі Беларусь;
- беларусы ў Беларусі;
- замежная аўдыторыя.

[2] Раней у гэтым спісе была і Грузія, але праз змены ў палітычным клімаце краіны шмат якія культурніцкія актары разам з іншымі прадстаўнікамі беларускае грамадзянскае супольнасці вымушаны пераязджаць у іншыя краіны.

Найчасцей можна ўбачыць разнастайнае камбінаванне гэтых арыентацыяў. Асабліва апошнім часам, калі зацікаўленасць беларускае дыяспары ва ўдзеле ў мясцовым беларускім культурніцкім жыцці знізілася. Тут жа адзначым, што часта тыя з беларускіх арганізацыяў, якія арыентуюцца найперш на замежнага спажыўца, таксама залучаюць замежных культурніцкіх дзеячаў ды інстытуцыі ў вытворчасць сваёй прадукцыі, што спрыяе пашырэнню супрацы і абмену.

## СУВЯЗІ І ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ КУЛЬТУРНІЦКІХ АКТАРАЎ. СЕТКІ, АСАЦЫЯЦЫІ І КААЛІЦЫІ

Калі параўноўваць агульную сітуацыю ў сферы культуры на сёння і год таму (на час нашага папярэдняга даследавання) з пункту гледжання ўзроўню ўзаемадзеяння паміж культурніцкімі актарамі, шчыльнасці сувязяў і г. д., то асаблівых зменаў не назіраецца. Як і раней, у эміграванай частцы беларускае культуры геаграфічная раз’яднанасць, вострая нястача часу і рэсурсаў для наладжвання ўзаемадзеяння, не звязанага з рэалізацыяй канкрэтнага праекту, адносна невысокі ўзровень самога праектнага ўзаемадзеяння ды іншыя праблемы замінаюць фармаванню пажаданае шчыльнасці сувязяў. Па-ранейшаму адзін з самых распаўсюджаных каментароў экспертаў да пытання пра камунікацыю і кааперацыю – выраз “кожны сам па сабе”.

Вынікі онлайн-апытання пацвярджаюць меркаванні экспертаў. Гэтак, на пытанне **“Наколькі вы задаволеныя цяперашнім узроўнем супрацы/узаемадзеяння вашай арганізацыі з іншымі арганізацыямі ў сферы культуры?”** толькі 4 з 50 арганізацыяў, што ўзялі ўдзел у даследаванні, адказалі, што цалкам задаволеныя гэтым узроўнем, у той час як палова апытаных (25 з 50) задаволеная толькі часткова і хацела б павысіць узровень супрацы, а яшчэ амаль чвэрць (12 з 50) цалкам незадаволеная станам супрацы і ўзаемадзеяння. Менш як траціна рэспандэнтаў (14 з 50) хоць неяк узаемадзеіць з якой-кольвек сеткавай ці парасонавай арганізацыяй. Сярод **праблемаў**, што замінаюць арганізацыям дасягнуць жаданага ўзроўню супрацы і ўзаемадзеяння, найчасцей называюць **нястачу часу і рэсурсаў**

**для наладжвання ўзаемадзеяння, брак інфармацыі пра іншыя ініцыятывы ды адсутнасць агульных пляцовак для абмеркавання ідэяў, кірункаў развіцця, пошуку новых партнёраў.**




Дыяграма 1. Праблемы і перашкоды ў працэсе наладжвання супрацы паміж арганізацыямі ды ініцыятывамі[3]

Адзначым, што ў апытанні 2023 году рэйтынг праблемаў быў крыху іншы: другую і трэцюю пазіцыю займалі праблемы ў камунікацыі ды ўзгадненні інтарэсаў, а таксама пытанні бяспекі. Праблемы нястачы інфармацыі і агульных пляцовак займалі месцы 4–5 паводле актуальнасці, хоць і з невялікім адрывам. **Але галоўнай праблемай, якую адзначалі культурніцкія арганізацыі і ў 2023-м, і ў 2024-м, застаецца нястача рэсурсаў арганізацыяў, каб займацца пытаннямі наладжвання ўстойлівых сувязяў і супрацы з іншымі актарамі культурнага поля.**

[3] Пры адказе на пытанне можна было абіраць некалькі варыянтаў з прапанаваных.

Даволі падобна выглядаюць і характарыстыкі колькасці партнёрскіх сувязяў, і характар суб’ектаў, з якімі ажыццяўляецца супраца, зафіксаваныя ў апытаннях 2023 і 2024 гадоў. Сярэдні паказнік колькасці арганізацыяў, з якімі ўдзельнікі даследаванняў 2023 і 2024 гадоў мелі сістэматычную альбо эпізадычную супрацу цягам году, складаў 4–5 арганізацыяў. Характар суб’ектаў, найчасцей называных рэспандэнтамі, таксама не змяніўся: гэта сеткавыя альбо буйныя арганізацыі шырокага профілю; арганізацыі, установы, гурты і нават асобныя творцы, якія працуюць у той жа галіне; фонды і праграмы падтрымання; хабы і прасторы; выдавецтвы і кніжныя фестывалі; фабрыкі думкі (think tanks) і адукацыйныя ініцыятывы; тэматычныя медыярэсурсы.

Найчасцей у якасці партнёраў у сёлетнім апытанні згадваліся наступныя арганізацыі:

- Беларуская Рада культуры,
- Беларускі ПЭН,
- фонд Tutaka,
- Дом творцаў у Варшаве,
- Create Culture Group,
- Free Belarus Center,
- выдавецтва “Янушкевіч”,
- Музей Вольнай Беларусі.

Пры даволі стабільнай карціне ўзроўню ўзаемадзеяння ў беларускім культурным полі нельга не адзначыць праяўлення новых установак. Агульная сітуацыя ў сферы культуры з часам стала набываць рысы ўстойлівасці з пункту гледжання перспектываў, і гэтыя рысы – як адмоўныя, гэтак і станоўчыя – сталі ўспрымацца культурніцкімі актарамі як пэўны статус-кво. Можам казаць пра больш асэнсаваны запыт на кааперацыю і больш яснае ўяўленне пра канкрэтныя і рэалістычныя кірункі прыкладання агульных высілкаў, а таксама працоўныя схемы і формы, у якіх такое прыкладанне магло б быць рэалізаваным. **Сярод такіх, між іншым, называлі стварэнне агульных PR-стратэгіяў і шляхоў павышэння ўвагі да дзейнасці беларускіх творцаў, менеджарскае падтрыманне, пытанні выбудовы працоўных партнёрстваў з мясцовымі ўладамі і лакальнымі (небеларускімі) культурніцкімі арганізацыямі.**

Другое назіранне датычыць характару ўзаемадзеяння ў кірунку дапамогі рэпрэсаваным дзеячам, пытаннях праваабароны ў культурніцкай сферы, адвакатаванні інтарэсаў культурніцкай тэмы ды інш. Нягледзячы на тое, што такога кшталту заданні развязваюцца за межамі ўстойлівых платформаў і сістэмных арганізацыяў, а хутчэй ad hoc, розныя культурніцкія актары даволі хутка яднаюцца пры ўзнікненні адпаведнае нагоды для іх развязання. Пры гэтым па-за межамі такога аперату́ўнага рэагавання ўзровень узаемадзеяння і камунікацыі можа быць не на самым высокім узроўні. Гэта ж справядліва і ў дачыненні праектнага ўзаемадзеяння: сітуацыйныя партнёрствы, што натуральным чынам узнікаюць і гэтак жа натуральна знікаюць, – даволі распаўсюджаная практыка.

Што датычыць сітуацыі ў Беларусі, то тыя звесткі, што нам удалося здабыць, таксама сведчаць пра асцярожна-пазітыўныя змены: паступова адыходзячы ад усіх шокаў апошніх гадоў, культурніцкія дзеячы, якія канчаткова для сябе пастанавілі заставацца і намацваць шляхі публічнае культурніцкае дзейнасці ў Беларусі, групуюцца паводле інтарэсаў, аднаўляюць тусоўкі і кам'юніці. Але пакуль рана гаварыць пра вынікі і канкрэтныя контуры аднаўлення сувязяў – тут мы можам зафіксаваць, хутчэй, інтэнцыю, чымся рэальны працэс.

Калі казаць пра разрыў паміж тымі, хто з'ехаў, і тымі, хто застаўся, то, на думку экспертаў, ён па-ранейшаму фіксуецца як самая прынцыповая лінія падзелу сектару. Але сёлета такі стан рэчаў усё больш успрымаецца як натуральны і ў пэўным сэнсе фатальны. Сітуацыя падаецца непераадольнай, і ў перспектыве разрыў можа толькі паглыбіцца. Тым не менш кантакт паміж гэтымі дзвюма часткамі беларускае культуры існуе як на ўзроўні простых чалавечых стасункаў і сяброўства, гэтак і ў плане дзейнасці (рэалізацыі агульных творчых праектаў і г. д.).

У перыяд 2023–2024 гадоў можна назіраць працяг трэнду на стварэнне рознага кшталту галіновых і тэматычных сеткавых структураў, кааліцыйных аб'яднанняў і асацыяцыяў. У мінулым даследаванні мы зафіксавалі стварэнне (ці прынамсі дэкларацыю пра намер стварыць) шасці арганізацыяў у сферах кіно[4], тэатру і харэаграфіі[5], нацыянальнае спадчыны, гісторыі і традыцыйнае культуры[6], літаратуры і выдавецкае справы[7].

[4] [redacted], Belarusian Independent Film Academy.

[5] Ішлося пра ініцыятыўную групу Беларускага інстытуту тэатру.

[6] Ішлося пра ініцыятыўную групу Інстытуту нацыянальнае памяці.

[7] Міжнародны саюз беларускіх пісьменнікаў, ініцыятыўная група Інстытуту беларускае кнігі.

Цяпер можна адзначыць працяг інстытуцыйнага афармлення Беларускага інстытуту тэатру (БІТ)[8], Інстытуту беларускае кнігі[9], юрыдычнае афармленне Беларускага інстытуту публічнае гісторыі[10].

Варта звярнуць увагу на факт узнікнення дзвюх ініцыятываў ад беларускіх незалежных фатографаў. Гаворка пра стварэнне ў верасні 2023 году Беларускай незалежнай фатаграфічнай асацыяцыі, а таксама пра перафарматаванне дзейнасці фоташколы – [redacted], што на новым этапе свайго развіцця імкнецца быць платформаю для культывавання вакол сябе супольнасці беларускіх фатографаў, фасілітацыі працэсаў развіцця гэтае супольнасці і г. д.

Таксама не так даўно было створанае кам’юніці вакол закрытай онлайн-суполкі “Сетка” (ініцыятыва Беларускага ПЭНу).

Яшчэ адна новая структура з’явілася ў беларускіх музыкаў – [redacted], што імкнецца рэпрэзентаваць беларускіх творцаў за мяжою, быць грамадскаю платформаю для стасункаў і прафесійнага развіцця, а таксама фасілітаваць дабрачынны гастрольны музычны рух. Ініцыятыва цяпер на стадыі канцэптуальнага і юрыдычнага афармлення ды пошуку рэсурсаў.

Такім чынам поле сеткавых і кааліцыйных структураў культурніцкага кірунку папоўнілася як мінімум **чатырма** новымі ініцыятывамі. Гэтыя інстытуцыі створаныя ў дадатак да падобных сеткавых і кааліцыйных структураў, што існавалі раней[11].

Эксперты адзначаюць: гэтыя структуры часта сутыкаюцца з немагчымасцю зрэалізаваць абвешчаныя мэты, і іх дзейнасць у выніку зводзіцца да вузкай інфармацыйна-медыйнай працы ці ўвогуле не выходзіць за межы правядзення адной – дзвюх устаноўчых канферэнцыяў. Зацікаўленасць культурніцкіх актараў ва ўдзеле ў працы такіх аб’яднанняў даволі нізкая, а ўмоваю для яе павышэння можа быць хіба толькі здольнасць гэтых структураў развязваць канкрэтныя праблемы і прыцягваць рэсурсы.

На гэты момант паспяховым чынам вылучаюцца Беларускі ПЭН, што здолеў заняць важную ды актуальную нішу (абарона культурніцкіх правоў) і вакол яе аб’ядноўваць культурніцкіх актараў, а таксама Беларуская Рада культуры – на сёння фактычна адзіная беларуская

[8] Устаноўчая канферэнцыя прайшла ўвосень 2023 году.

[9] Устаноўчая канферэнцыя прайшла ў пачатку 2023 году.

[10] Афіцыйную рэгістрацыю інстытут атрымаў у ліпені 2024 году ў Польшчы.

[11] Гаворка пра такія арганізацыі, як Беларуская Рада культуры, Беларускі ПЭН, [redacted] і г.д.

арганізацыя, што ў новых умовах з нуля здолела павялічыць свой патэнцыял і зрабіцца рэсурснаю базаю для развіцця беларускае незалежнае культуры.

Аднак нават у дачыненні адносна паспяховых структураў захоўваецца недавер, ёсць неразуменне іх парадку дня і мэтаў творцамі, асабліва на фоне адсутнасці неабходных для развязання стратэгічных заданняў рэсурсаў.

Акрамя таго, палітызаванасць і экстрэмісцкі статус некаторых буйных сеткавых і фасілітацыйных структураў робяць фактычна немагчымаю адкрытую супрацу з імі для культурніцкіх актараў у Беларусі.

Станоўча можна ацаніць дзейнасць медыйных сеткавых праектаў і платформаў, што падыходзяць да пабудовы культурніцкае супольнасці ды фасілітацыі праз арганізацыю беспасярэдняй сувязі з грантадаўцамі ды інвестарамі. Пакуль гаворка пра онлайн-суполкі, напрыклад, sekktor і [redacted], дзе для ўдзельнікаў адбіраюцца і прапануюцца найбольш рэлевантныя грантавыя праекты і праграмы.
Таксама можна адзначыць распаўсюд практык кам'юніці-білдынгу: шмат якія культурніцкія арганізацыі вылучаюць у якасці асобнага задання для сваёй дзейнасці пабудову супольнасці вакол сябе. Гэта можна ўспрымаць як адну з тактык адаптацыі да бягучых умоваў і спробу адшукаць нутраны патэнцыял для самаразвіцця.

## ТРЭНДЫ І ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ НЕЗАЛЕЖНАЕ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ (2023–2024)

Прааналізаваўшы інфармацыю, атрыманую падчас інтэрв'ю з экспертамі, а таксама супаставіўшы яе з вынікамі онлайн-апытання, мы здолелі вылучыць наступныя агульныя трэнды сферы культуры.

1. **Эрозія творчага патэнцыялу палітычнае тэмы.** На хвалі палітычных падзеяў 2020 году для беларускіх незалежных культурніцкіх актараў галоўнымі матывамі сталіся салідарнасць і культурніцкі пратэст. Але ўжо ў 2023-м назіралася паступоваеаднаўленне апалітычнае культурніцкае вытворчасці і адыход ад траўматычных тэмаў. Сёння ж

гучаць меркаванні пра вычарпанасць гэтае тэмы, падзенне цікавасці да яе ў беларускай і замежнай аўдыторыяў, неабходнасць выйсці з каляіны ахвяры і шукаць новую сюжэтыку ды ідэйную аснову творчасці. Тэма рэпрэсіяў і салідарнасці застаецца важнай, аднак гаворка пра сфармаванае і даволі абмежаванае кола творцаў ды іхнай аўдыторыі (пратэставы касцяк), якое ў гэтай сітуацыі ўжо не рэпрэзентуе мэйнстрыму.

2. **Прасяданне культурніцкага цыклу на стадыі стварэння.** Спад аўтарскай актыўнасці, стварэння ўнікальных мастацкіх твораў. Пры гэтым іншыя стадыі культурніцкага цыклу (вытворчасць/выданне, распаўсюд) у розных культурніцкіх галінах могуць дэманстраваць значна больш пазітыўную дынаміку. Часткова такая сітуацыя звязаная з ідэйным вакуумам, што з'явіўся на фоне вычарпання палітычнае тэмы.

3. **Крызіс ідэі галіновых інстытутаў (сеткавых і кааліцыйных аб'яднанняў, асацыяцыяў, сектаральных фасілітатараў).** Цягам 2023 году актыўна фармаваліся новыя ініцыятывы, што імкнуліся сабраць вакол сябе культурніцкіх актараў, каб разам шукаць магчымасці для развіцця. Пэўную інерцыю гэтага працэсу можна было назіраць і ў 2024-м, але варта адзначыць расчараванне шмат якіх дзеячаў культуры, бо дэкларацыя такімі структурамі мэты і планы не адпавядалі іх рэальным магчымасцям. Аднак шэраг ініцыятываў імкнецца рэалізоўваць функцыю фасілітацыі і ствараць кола зацікаўленых удзельнікаў як мінімум, збіраючы інфармацыю пра конкурсы, грантавыя праграмы і г. д.

4. **Пераарыентацыя на замежнага (лакальнага) спажыўца.** Гэты трэнд, які мы фіксавалі і ў папярэднім даследаванні, паглыбіўся ды зрабіўся актуальны для шырокага кола культурніцкіх актараў у эміграцыі. Такі кірунак вызначаюць як базавую стратэгію развіцця на найбліжэйшую будучыню нават арганізацыі, ідэйна завязаныя на спецыфічна беларускім кантэксце. З адыходам ад арыентацыі на беларускую аўдыторыю як асноўную змяняецца і ўспрыманне межаў беларускага культурнага поля як такога. Сярод арганізацыяў, што бралі ўдзел у онлайн-апытанні і ў 2023, і ў 2024 гадах, толькі крыху больш за палову (60 %) адзначаюць Беларусь у якасці асноўнае тэрыторыі, на якую скіраваная іх дзейнасць: тут амаль нічога не змяняецца. Аднак удзельнікі апытання 2024-га нашмат часцей называюць сярод арганізацыяў, з якімі яны ўзаемадзеюць або лічаць уплывовымі, установы культуры еўрапейскіх краінаў, міжнародныя фонды і г. д.

5. **Прафесіяналізацыя і асваенне новых магчымасцяў на фоне паступовага скарачэння скіраванае на беларускую грамадзянскую супольнасць фінансавае дапамогі.** У Беларусі, пачынаючы з 2020–2021 гадоў, легальная магчымасць скарыстацца замежнаю грантаваю дапамогаю была цалкам перакрытая, і гэты драйвер развіцця незалежнага культурнага поля страціў сваю актуальнасць. Культура ў эміграцыі магла яшчэ некаторы час карыстацца інерцыяй салідарнасці міжнароднае супольнасці. Аднак цяпер актары за мяжою прыйшлі да ўсведамлення вычарпанасці такое мадэлі. Ініцыятывы сталі надаваць больш увагі міжнародным грантавым праектам, праграмам рэзідэнцыяў ды іншым ініцыятывам, не скіраваным спецыфічна на беларусаў. Таксама грамадскія культурніцкія арганізацыі задумваюцца над наданнем камерцыйных паслуг. Важным падтрыманнем, хоць і не вельмі ёмістым, ёсць інструменты краўдфандынгу. Выхад на лакальныя або еўрапейскі культурніцкія рынкі патрабуе іншага ўзроўню рыхтавання, таму ініцыятывы актыўна павышаюць якасць менеджменту. У Беларусі дэфіцыт рэсурсаў для развіцця развязваецца ў асноўным шляхам спалучэння творчае дзейнасці для душы і людзей з камерцыйным складнікам (пляцоўка для канцэртаў, выставаў, кавярня, бар, крама і г. д.).

6. **Ажыўленне культурніцкай актыўнасці ў Беларусі.** Нягледзячы на працяг негатыўных наступстваў палітычнага крызісу 2020-га, за апошні год назіраецца аднаўленне культурніцкага жыцця ў Беларусі, у тым ліку публічнае незалежнае вытворчасці і дзейнасці, на якую жыва рэагуе ўнутрыбеларуская аўдыторыя. Асабліва імкліва развіваецца музычная сфера. Тут можна падкрэсліць дзве акалічнасці: па-першае, падрасла новая генерацыя моладзі, прадстаўнікі якой былі падлеткамі падчас падзеяў 2020-га і не бралі ўдзелу ў пратэстах; па-другое, тыя творцы, якія свядома і канчаткова пастанавілі застацца ў Беларусі, паступова намацваюць магчымасці для дзейнасці ў новых абставінах.

Як у цэлым ацэньваюць стан беларускага культурніцкага сектару? Самая папулярная кваліфікацыя сітуацыі, якую абралі амаль ⅔ рэспандэнтаў (30 з 50), – перасамавызначэнне і перазбор. Каля траціны апытаных называюць словы “крызіс” і “пераход у падполле”. Складанасць агульнай, цэласнай ацэнкі стану беларускага культурнага поля выявілася і падчас апытання: некаторыя рэспандэнты абіралі супрацьлеглыя характарыстыкі, пакідаючы каментары пра тое, што беларуская культура з розных бакоў мяжы развіваецца асінхронна.




Дыяграма 2. Ацэнка стану беларускага поля падчас онлайн-апытання[12]

[12] Пры адказе на пытанне можна было абіраць некалькі варыянтаў з прапанаваных.

## АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ І ВЫКЛІКІ

Сярод праблемаў і выклікаў, якія наймацней паўплывалі на стан беларускага культурнага поля ў 2023–2024 гадах, па выніках экспертных інтэрв'ю, можна адзначыць наступныя.

1. **Негатыўныя наступствы палітычнага крызісу 2020 году.** Практыкі цэнзуры і вымушанае самацэнзуры, рэпрэсіі (ад забароны на прафесію да крымінальнага пераследу). Культурны рэнесанс у краіне, пра які кажуць некаторыя эксперты, адбываецца на фоне рэалізацыі дзяржаўнае культурніцкае палітыкі, што не змяніла асноўных установак на прывядзенне сферы да поўнае падкантрольнасці ды ідэалагічнае чысціні.

2. **Спад цікавасці да дзейнасці беларускіх культурніцкіх актараў.** На гэта бачым некалькі прычынаў. Па-першае, згасанне эфекту 2020 году і дэпалітызацыя беларускае дыяспары. Па-другое, асіміляцыйныя працэсы ў дыяспарах: людзі асвойваюцца ў замежжы, вывучаюць мовы і пачынаюць карыстацца мясцовай (небеларускай) культурніцкай інфраструктурай. Гэта датычыць як спажыўцоў, гэтак і артыстаў.

3. **Недастатковая бачнасць беларускае культуры за мяжою.** Беларускія культурніцкія дзеячы ўсё больш востра адчуваюць нястачу шырокага пазіцыянавання, PR'у, рэкламы, прадакшану і г. д. Ліквідацыя гэтае нястачы, на думку экспертаў, дазволіць пашырыць аўдыторыю за кошт палітычна неангажаваных беларусаў і еўрапейскае публікі.

4. **Нястача менеджарскіх кампетэнцыяў,** што ў спалучэнні з вышэй згаданаю праблемаю перашкаджае больш шырокаму і выгаднаму пазіцыянаванню на рынку. Часта творцы ці калектывы, якія маюць што прапанаваць спажыўцам, не валодаюць базавымі кампетэнцыямі ў працы з асабістым брэндам, пазіцыянаваннем, складанні грантавых заявак і г. д.

5. **Нястача рэсурсаў для развіцця.** З кожным годам робіцца ўсё менш грантавых праграмаў і праектаў, скіраваных на падтрыманне беларускіх творцаў. Падчас онлайн-апытання больш за палова ўдзельнікаў (26 з 50) адзначыла, што іхная арганізацыя альбо ў няўстойлівым стане, альбо на мяжы выжывання. Разважаючы пра перспектывы развіцця або існавання арганізацыі на найбліжэйшыя тры гады, шмат якія рэспандэнты адзначылі, што перспектывы залежаць ад магчымасці дасягнуць фінансавай устойлівасці. Рэакцыя можа быць розная: сыходзіць у іншыя сферы, шукаць камерцыйныя стратэгіі развіцця, скарачаць колькасць і аб'ём

выпуску прадукцыі і г. д. Ёсць прыклады паспяховых камерцыйных праектаў, створаных беларусамі як за мяжою, гэтак і ў Беларусі, але нават адносна паспяховыя камерцыйна арыентаваныя культурніцкія ўстановы перыядычна адчуваюць патрэбу ў датацыях. Што датычыць некамерцыйных культурніцкіх актараў у эміграцыі, ёсць прынявцце незваротнасці пагаршэння сітуацыі з адраснай дапамогай ад міжнародных інстытуцыяў, што пераарыентоўвае ўвагу беларускіх арганізацыяў да значна больш шырокага міжнароднага грантавага (і не толькі) рынку.

6. **Кароткі гарызонт планавання і засяроджанасць на развязанні аператыўных заданняў.** Складаная фінансавая сітуацыя, высокі ўзровень канкурэнцыі і абмежаваны аб'ём культурніцкага рынку амаль не пакідаюць рэсурсаў, што можна выдаткаваць на доўгатэрміновыя заданні.

7. **Слабая зарганізаванасць і скаардынаванасць культурніцкіх актараў за мяжою.** Спецыфічныя ўмовы творчасці, нястача часу і рэсурсаў, а часам і канкурэнцыя перашкаджаюць выбудоўваць цэласную культурніцкую інфраструктуру ды наладжваць сістэматычнае ўзаемадзеянне паміж беларускімі культурніцкімі актарамі. У такіх умовах не ўдаецца выпрацаваць нават больш-менш рацыянальнае схемы ўзаемадзеяння з публікаю. Былі выпадкі, калі ў адным горадзе адначасова ладзіліся дзве буйныя імпрэзы для беларусаў.

8. **Праблема сувязі паміж дзвюма часткамі беларускае культуры** – у Беларусі і за яе межамі. Тут і візавыя абмежаванні, і страта працоўных кантактаў, і практыкі цэнзуравання ды ўскладненне доступу да незалежнае прадукцыі, што вырабляецца за межамі краіны... Выезды творцаў на рэтрыты, адукацыйныя праграмы, удзел у непалітычных культурніцкіх імпрэзах ці проста для турызму і сустрэчаў з калегамі – адна з нешматлікіх магчымасцяў рэальнага культурніцкага абмену паміж Беларуссю і Еўропай.

У онлайн-апытанні выбудаваўся наступны рэйтынг праблемаў, што рэспандэнты лічаць найбольш актуальнымі для развіцця арганізацыяў і ініцыятываў у сваёй галіне.




Дыяграма 3. Рэйтынг праблемаў[13]

Рэйтынгі найбольш актуальных праблемаў па выніках апытанняў 2023 і 2024 гадоў выглядаюць амаль ідэнтычна: на першым месцы з вялікім адрывам – фінансаванне; другое і трэцяе месца дзеляць нястача эфектыўнага менеджменту ды нізкі ўзровень супрацы паміж рознымі арганізацыямі – іх лічыць актуальнымі больш як палова ўдзельнікаў абодвух апытанняў. Наступнымі паводле актуальнасці, як і ў 2023-м, выступаюць праблемы доступу да аўдыторыі і рыхтавання кадраў.

[13] Пры адказе на пытанне можна было абіраць некалькі варыянтаў з прапанаваных.

# АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ ДАСЛЕДАВАННЯ: НОВЫ СТАТУС-КВО, ДВА ТРЭКІ РАЗВІЦЦЯ КУЛЬТУРНІЦКАЙ ЭМІГРАЦЫІ І КАНЕЦ ІЛЮЗІЯЎ

Нашае даследаванне праводзілася ў сітуацыі асіметрыі публічнасці: культурніцкія дзеячы ў краіне часта працуюць напалову падпольна, пазбягаючы публічнасці, што робіць іх нябачнымі для вонкавага назірання і даследавання. Гэтая акалічнасць нярэдка спараджае стаўленне да Беларусі як да выпаленае зямлі, што спрыяе назапашванню супярэчнасцяў і рассінхранізацыі разумення сітуацыі паміж актарамі ў краіны і за яе межамі. На жаль, розныя абмежаванні пры зборы інфармацыі пра сітуацыю ў Беларусі не дазваляюць паўнавартасна прааналізаваць, а галоўнае – публічна асвяціць тое, што адбываецца ў краіне. З гэтае прычыны сфармуляваныя ніжэй высновы адносна культурніцкае сітуацыі ў Беларусі носяць абмежаваны характар.

**1. Разрыў культурнага поля на тых, хто з'ехаў, і тых, хто застаўся, не як праблема, а як новы статус-кво.** Нягледзячы на рытарычныя і практычныя захады культурніцкіх гульцоў захоўваць сувязь з вялікаю зямлёю, мы вымушаныя канстатаваць амаль паралельнасць развіцця дзвюх частак беларускае культуры. 2024 год прынёс яснае ўсведамленне бар'ераў, што замінаюць уздзеянню з-за мяжы на культурніцкую сітуацыю ў Беларусі.

На такі стан рэчаў паўплывалі некалькі фактараў. **Першы:** фінансавая дапамога з-за мяжы фактычна забароненая, рызыкі ў гэтым плане значна перавышаюць магчымыя здабыткі ад абыходу забароны. **Другі:** паступовае намацванне ў краіны і за яе межамі магчымасцяў для аўтаномнага развіцця. **Трэці:** абмежаванні (рызыкі для асабістае бяспекі, блакаванне незалежных рэсурсаў, візавыя абмежаванні і г. д.), што замінаюць беларускім творцам хаця б час ад часу браць удзел бяспечным для сябе чынам у жыцці беларускай культурніцкай эміграцыі і, наадварот, эміграцыі ў культурніцкім жыцці ў краіне (увозіць культурніцкую прадукцыю, кнігі і г. д.).

**2. Новая дыхатамія: дзве траекторыі беларускае культуры ў эміграцыі.** Раней пры апісанні структуры беларускага культурнага поля можна

[14] Especially considering that many cultural actors outside Belarus who help creators have extremist status within Belarus and contact with them is criminalized.

было назіраць некалькі лініяў водападзелу: дзяржаўныя і незалежныя; тыя, хто з’ехаў, і тыя, хто застаўся; і г. д. У 2024 годзе можна канстатаваць з’яўленне не менш прынцыповае лініі падзелу: на культурніцкіх актараў, якія імкнуцца ўтрымацца на трэку развіцця 2020–2021 гадоў, працягваюць палітычна-пратэставы дыскурс, абапіраючыся на касцяк нацыянальна-ангажаваных эмігрантаў-беларусаў, і на тых культурніцкіх дзеячаў, якія так ці інакш спрабуюць выйсці з гэтага аўдыторнага кола і знайсці шлях рэалізацыі на міжнароднай культурнай прасторы.

Спад палітычнае салідарнасці, асіміляцыя эмігранцкае супольнасці, а таксама слабы PR наўрад ці дазволяць выйсці на пазітыўную дынаміку развіцця ініцыятывам першае групы. Але і арганізацыі другое групы сутыкаюцца з выклікамі. Гэта высокая канкурэнцыя на заходніх культурніцкіх рынках і неабходнасць быць гатовымі адмовіцца ад беларускай ідэнтыфікацыі праектаў на карысць пазіцыянавання ў якасці еўрапейскай ініцыятывы (польскай, літоўскай і г. д.), хаця б на ўзроўні конкурсных заявак. Другі шлях развіцця (пераарыентацыя на міжнародную культурную прастору) не можа быць адзіным выйсцем з крызісу.

**3. Новыя магчымасці і новыя рызыкі.** Арганізацыі ды ініцыятывы ўсведамляюць: выхад са стагнацыі палягае ў пераарыентацыі на лакальную і міжнародную аўдыторыі, асваенні еўрапейскіх культурніцкіх конкурсаў, праграмаў і г. д. Безумоўна, такі выхад у свет абяцае шмат плюсаў беларускай культуры і можа якасна палепшыць яе міжнароднае пазіцыянаванне, пазнавальнасць і прэстыж. Але разам з тым пры такой стратэгіі паўстае праблема ўтрымання беларускага кантэксту (беларускасці). З’яўляецца рызыка зліцця з еўрапейскім культурным кантэкстам, асабліва ў вачах аўдыторыі ў Беларусі, пры наяўных абмежаваннях доступу да культурніцкага прадукту, які прадукуецца ў эміграцыі[15].

**4. Ад культурніцкага супраціву да забаўляльнае сферы.** І да 2020 году беларуская незалежная культура мела адметны флёр пратэсту, супраціву, імкнення да палітычнае свабоды. Разам з тым палітычная ангажаванасць была ўласцівая далёка не большасці культурніцкае прадукцыі: існавала і карысталася попытам больш мірная сюжэтыка. Рэпрэсіі супраць творчай эліты, жорсткія практыкі цэнзуры і кантролю з боку дзяржавы пазбавілі незалежную культуру магчымасці выходзіць за межы арганізацыі вольнага часу рабочых. Таму шмат у чым той

[15] Тут варта адзначыць важнасць такіх праграмаў падтрымання, як ArtPower Belarus, што рэалізуюцца з оптыкаю на разуменне беларускага культурнага кантэксту, што робіць іх надзвычай важнымі для ўтрымання беларускіх актараў у фокусе нацыянальнае павесткі.

культурны пад’ём у краіне, што можна назіраць апошнім часам, мае выразны забаўляльны характар (майстар-класы, лекцыі пра класікаў сусветнага жывапісу, канцэрты класічнае музыкі і г. д.).

У эміграцыі таксама бачыцца падобная тэндэнцыя, але асноўныя прычыны пераходу да вытворчасці апалітычнага кантэнту – згаданыя вышэй вычарпанасць палітычнае сюжэтыкі і стомленасць траўматычнымі тэмамі.

**5. Развіццё праз крызіс і вымушаны прагрэс.** Гэта і павышэнне прафесіяналізацыі, і асваенне лакальных ды міжнародных культурніцкіх рынкаў, і мода на кам’юніці-білдынг... Усё гэта ў той ці іншай ступені – адаптацыя да даволі неспрыяльных умоваў і выклікаў. Пакуль рана ацэньваць гэты вымушаны прагрэс, але важна адзначыць уласна змену парадыгмы, у якой культурніцкія арганізацыі сябе ўсведамляюць, а таксама канец шмат якіх марных спадзяванняў, напрацоўванне важных гузоў, з’яўленне гісторыі свайго руху за мяжою.

## КІРУНКІ РАЗВІЦЦЯ: РЭКАМЕНДАЦЫІ І МАГЧЫМЫЯ НАСТУПНЫЯ КРОКІ

1. Вынікі даследавання дазваляюць абазначыць хібы трансмежнага статусу беларускае культуры, а менавіта прыкметы ўтварэння архіпелагу субкультураў. У дадатак да дуальнасці тых, хто з’ехаў, і тых, хто застаўся, пачынаюць праяўляцца іншыя падзелы, што спараджаюць новыя межы і блакуюць узаемаўплыў розных субкультурных выспаў адна на адну.

Калі паглыбленне архіпелажнага статусу – негатыўны сцэнар для беларускае культуры, то культурніцкім актарам можна прапанаваць **захады для пераадолення супярэчнасцяў і захавання адзінага контуру беларускае культуры** (хаця б адносна экспатнае часткі беларускае культуры):

**а) Культываванне дыялогу і ўзаемапрыняцця паміж рознымі культурніцкімі суб’ектамі,** аб’яднанымі агульнаю сітуацыяй эміграцыі,

але з рознымі падыходамі ў практыцы і ўяўленнямі пра мэты. Гэта, напрыклад, арганізацыя конкурсных праграмаў, стварэнне медыястратэгіяў, якія б спрыялі ўсведамленню культурніцкімі актарамі каштоўнасці і важнасці ўнёскаў кожнага ўдзельніка ў супольную справу. Лога такіх актыўнасцяў – мы патрэбныя адно аднаму.

**б) Рэвізія канцэптуальных межаў, у якіх мы мыслім беларускую культуру, і пераасэнсаванне самога панятку беларускае культуры.** Нельга сказаць, што беларуская культура ў дакрызісны час не мела прыкметаў разнастайнасці, якую мы назвалі архіпелагам субкультураў. Але раней агульная тэрытарыяльная прывязка і агульныя ўмовы былі галоўнымі фактарамі яднання, што дэпраблематызавалі канцэптуальнае вызначэнне беларускае культуры. Сёння ва ўмовах трансмежнасці асобныя часткі культурнага поля часта выпадаюць з фокусу ўвагі і рыторыкі розных актараў-фасілітатараў. Напрыклад, пытанне прыналежнасці да беларускае культуры часам развязваюць праз прызму мовы і традыцыі, не звяртаючы ўвагі на сучаснае абстрактнае беларускае мастацтва, у якім няма відавочных адсылак да такое беларускасці. Акрамя гэтага, усё больш актараў арыентуюць свае творы на замежную аўдыторыю, пераходзячы пры гэтым на іншую мову.

Відавочна, любыя намаганні наноў вызначыць канцэптуальнае напаўненне панятку беларускасці, хутчэй, прывядуць да новых канфліктаў ці проста не будуць успрынятыя большасцю. Таму, на наш погляд, варта звярнуцца да практык кіравання ўяўнаю рэальнасцю беларускае культуры і арганізацыі сімвалічнае публічнае прасторы. Гаворка пра выяўленне і пазначэнне ў публічнай прасторы культурніцкіх дамінантаў, вакол якіх могуць быць сканцэнтраваныя дыскурсіўныя практыкі (публіцыстыка, даследаванні, асвятленне ў медыях, новая міфалогія, заданне трэндаў ды інш.), а ўслед за імі і практычная дзейнасць для падтрымання гэтых дамінантаў праз розныя ініцыятывы ды інстытуцыі. У якасці прыкладу традыцыйных дамінантаў можна прывесці беларускую мову і беларускую літаратуру; да патэнцыйных дамінантаў можна аднесці павагу да чалавечага жыцця, агульную ўстаноўку на мірнае залагоджанне канфліктаў і негвалтоўнасць.

Іншым адпраўным пунктам для рэканцэптуалізацыі культуры

можа быць інтэграванне базавых уяўленняў пра культуру, на якія абапіраецца Канвенцыя UNESCO аб ахове і заахвочванні разнастайнасці формаў культурніцкага самавыяўлення. Гэты канцэптуальны комплекс мае інструментальны характар, рэлевантны для пэўнага этапу развіцця сферы культуры.

**в) Распрацоўванне і рэалізацыя агульнае PR-стратэгіі.** Цяпер, калі значная частка аўдыторыі беларускіх культурніцкіх актыўнасцяў звузілася да ядра, якое амаль не прырастае новымі ўдзельнікамі, культурніцкі сектар як ніколі адчувае неабходнасць у **падцяпленні аўдыторыі і фарсаванай рэпрэзентацыі суб'ектаў, што сёння дзеюць у рэчышчы беларускае культуры.** Нашыя суразмоўцы думаюць, што ў беларускіх дыяспарах ёсць шмат таленавітых асобаў, якіх можна і варта залучаць у культурны абарот. Але гэтыя асобы проста не ведаюць пра існыя беларускія культурніцкія магчымасці. Таксама кажуць пра неабходнасць фармаваць моцную стратэгію для прасоўвання і прыцягнення ўвагі да беларускае сферы культуры, бо менавіта гэтае заданне можа стацца стрыжнем, вакол якога выбудуецца сістэматычнае і стратэгічнае ўзаемадзеянне культурніцкіх актараў. Прынамсі большая частка экспертаў свядома выказвала гатовасць укладацца ў такога кшталту кааперацыю.

Акрамя гэтага, зладжаная PR-стратэгія патрэбная і для выхаду на лакальны ды міжнародны ўзроўні. Адным з інфраструктурных элементаў агульнае PR-кампаніі могуць стацца рэпрэзентацыйна-дыскусійныя пляцоўкі для публічных абмеркаванняў і прапановаў “палітыкаў” у галіне развіцця культуры. Тут важна казаць не толькі аб прыняцці на сябе дакладных абавязанняў, а задаваць тон праз дэманстрацыю гісторый поспеху, выяўленне трэндаў, складанне і публічная прэзентацыя культурніцкіх рэйтынгаў, справаздачаў дзейнасці суб'ектаў і г. д. Гэтак, гаворка пра фармаванне поля ўзаемных арыентацыяў для культурніцкіх суб'ектаў, што будуць мець магчымасць самастойна выбіраць найбольш прыдатныя для сябе мадэлі развіцця, арыентавацца на паспяховыя ці прывабныя кейсы, далучацца да тых ці іншых практык і г. д.

**г) Лабіяванне візава-турыстычнага падтрымання для дзеячаў культуры,** якія жывуць у Беларусі, пашырэнне бяспечных практык рэтрытаў, рэзідэнцыяў, выездаў, удзелу ў адукацыйных і культурніцкіх імпрэзаў за мяжою. Гэта, бадай, самая надзённая патрэба.

**2. Узмацненне голасу Беларусі на міжнароднай арэне праз пашырэнне рэпрэзентаванасці беларускае культуры за межамі Беларусі.** Пасля 2022 году хваля салідарнасці міжнароднае супольнасці з праблемамі Беларусі са зразумелых прычынаў знізілася, што адбілася і на цікавасці розных пляцовак ды міжнародных гульцоў. Сёння ёсць патрэба ў больш устойлівых фарматах рэпрэзентацыі беларускае культуры на міжнароднай арэне.

Адным з патэнцыйных шляхоў развязання праблемы бачыцца інтэнсіфікацыя працы для залучэння Беларусі, рэпрэзентаванай незалежнымі культурніцкімі актарамі ў эміграцыі, у праграму “Крэатыўная Еўропа”. Гэта прадугледжвае супольную працу арганізацыяў для лабіявання і выканання неабходных патрабаванняў да краінаў-удзельніц. Залучэнне ў праграму адкрые магчымасці рэальна засвоіць практыкі развіцця культурніцкіх і крэатыўных індустрыяў ды ўкараніць у дзейнасць абноўленых канцэптуальных падставаў, пра якія ішлося ў пункце 1б.

**3. Узмацненне канкурэнтаздольнасці праз падвышэнне менеджарскіх кампетэнцыяў** культурніцкіх актараў. Нястача базавых кампетэнцыяў у менеджменце замінае развіццю творцаў ва ўмовах еўрапейскага рынку. Важнае заданне – стварыць беларускую школу культурніцкага менеджменту: гаворка не толькі пра стварэнне адукацыйных ініцыятываў, але і фармаванне менеджарскіх установак у культурніцкіх дзеячах. Важна таксама мець магчымасці арганізаваць паэтапнае суправаджэнне творчых праектаў.

**4. Даследчая і аналітычная праца.** Адзін з гнуткіх інструментаў кіравання культураю – выяўленне і наданне актуальнай аналітычнай інфармацыі шырокаму колу актараў, зацікаўленых у развіцці беларускае культуры. Варта весці рэгулярны маніторынг, з дапамогай якога можна было б інвентарызаваць і візуалізаваць культурніцкія практыкі. З прычыны абмежаванасці публічнае рэпрэзентацыі культурніцкіх актараў у Беларусі заданне выявіць і апісаць поле варта развязваць без прывязвання да дзейнасці канкрэтных суб’ектаў ды ініцыятываў – праз маніторынг і фіксацыю агульных тэндэнцыяў **у афіцыйнай і незалежнай культурах, аналіз наратываў, характару ўплыву, праблемаў культурніцкага рынку (адсочванне спажывання пэўных культурніцкіх прадуктаў, звужэнне ды пашырэнне прапановы і г. д.).**